хадзіць нельга было. Лорачцы купіў кніжку Перельмана „Ракета на Луну“. Пасылаць ня буду: або прывязу, або як прыедзеце, дык тады забераце. Цалую Вас моцна

Ваш *Адам*.

## № 106. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*3.V.1935 г.*

Любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Ізноў я адзін тут. Даехаў добра. Які сёньня харошы дзень! Вось кончылася ўжо работа, і як–бы хацелася з Вамі пайсьці пагуляць. Тут куды менш гразі, як там у Слабадзкім. Сёньня я дзяжуру ў установе сваёй да [7 гадзін] вечара. Сяджу ў канторы, а перад вачыма Лорачка і Лялячка. Якія яны слаўныя былі ўчора! Буду чакаць, калі вы прыедзеце да мяне.

Лістоў ні ад кога гэтым часам ня было. Чакаю ў першую чаргу ад Нік[алая] Паўл[авіча]. Павінен хутка быць. Калі ня ўдасца ўвосень выбрацца на поўдзень, дык думаю, што тут можна будзе знайсьці кватэру. Шмат хто зьбіраецца выяжджаць з хлопцаў, што маюць кватэры. Ведаеш, Анечка, сёньня ў мяне такое адчуваньне, што чым бліжэй да тэрміну, тым даўжэйшым ён выдаецца і марудна вельмі–ж цягнецца. Сумна неяк, але ня сумую.

Любыя мае, ня сумуйце й Вы. Хутка зноў будзем разам.

Цалую Вас моцна.

Ваш *Адам*.

## № 107. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*6.V.1935 г.*

Дарагія і любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Сёньня я асабліва неяк чакаў ад Вас лістоўкі і ў гэтым чаканьні не памыліўся. Толькі ўстаў раніцою і вышаў глянуць у скрынку для лістоў, як знайшоў там Вашу лістоўку. А з лістоўкай от так і перанёсься я–б да Вас. Чым бліжэй да тэрміну, тым большае хваляваньне ахоплівае мяне. І сьняцца сны аб новым моманце ў нашым жыцьці. Ад Н[ікалая] П[аўлавіча] яшчэ няма адказу. Я ўжо пачынаю непакоіцца, ці дайшоў да яго мой ліст. Ад Уладзіка і Язэпа таксама няма ніякіх вестак. Змоўклі нешта.

Тут я штодзень абходжу магазыны, шукаючы Лорачцы туфлі, а таксама і табе, Анечка. Але ўсё яшчэ няма. Таксама і шапачак ня відаць. Хацелася–б ім купіць прыгожыя. Адчыніўся тут спэцыяльны дзіцячы магазын, але і ў ім асартымэнт тавараў невялікі.

Учора ў нас праводзілі падпіску на пазыку. Я падпісаўся на трыста. Анечка, не забудзься зайсьці ў Горт забраць мае аблігацыі.

Цалую Вас моцна.

Ваш *Адам*.